Дзяржаўная ўстанова культуры
«Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма»
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»**

# САМАЯ «ПЕРШАЯ»

**Да 115-годдзя з часу заснавання
дзяржаўнай установы адукацыі
«Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына»**

***Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне***

*2-е выданне,
дапрацаванае і дапоўненае*

Кобрын
2025

УДК 016:37.018(476.7)
ББК 91.9:74(4Беи)
С17

Серыя заснавана ў 2020 годзе

***Складальнік***
*С. Д. Курачук* - бібліёграф І катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі
дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая
цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

С17 **Самая «першая»** : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 115-годдзя з часу заснавання дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына». – 2-е выд, дапрац. і дап. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. - Кобрын, 2025. – 48 с. : фат. – (Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»).

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Самая першая» з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём першай у Кобрыне школы, яе знакамітымі выпускнікамі.

**УДК 016:37.018(476.7)**
**ББК 91.9:74(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2025

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Першае выданне з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» было прысвечана 110-гадоваму юбілею старэйшай адукацыйнай установы горада Кобрына – дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына».

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Самая першая» (2-е выданне, дапрацаванае і дапоўненае) выдадзена да 115-годдзя школы і дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём першай у Кобрыне школы, яе знакамітымі выпускнікамі.

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» размешчана па вуліцы Савецкай, 94. Будынак школы прыцягвае ўвагу сваёй прыгажосцю, велічнасцю і з’яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю Рэспублікі Беларусь.

Гісторыя школы № 1 неараздзельна ад гісторыі горада. Самым значным з'яўляецца тое, што яна стала сведкам двух стагоддзяў, прайшоўшы праз многія выпрабаванні, галоўным з якіх з'яўляецца, несумненна, час. Школу любяць і памятаюць, а пакуль яна жыве ў памяці, у сэрцы, у душы - жыццё ўстановы адукацыі працягваецца.

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Самая першая» мае наступную структуру:

Ад складальніка

I. Гартаючы старонкі школьнага летапісу

II. Сучасны дзень школы

III. Захавальнік гісторыі — школьны музей

IV. Знакамітыя выпускнікі школы

Спіс крыніц

Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Выданне прадстаўляе больш за 100 бібліяграфічных крыніц. Уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1971 года. Творы друку згрупаваны па відах: главы, раздзелы з кніг, часопісныя і газетныя артыкулы. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

У выданні прадстаўлены ілюстрацыйны матэрыял, фотаздымкі розных гадоў з віртуальнага музея на сайце ўстановы «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына», а таксама з фотаархіва цэнтральнай бібліятэкі.

Паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, адукацыяй, культурай.

*Выказваем падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы выдання настаўніцы гісторыі і грамадазнаўства дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» Наталлі Васільеўне Рагачук.*

# ГАРТАЮЧЫ СТАРОНКІ ШКОЛЬНАГА ЛЕТАПІСУ

Гісторыя будынка, які перажыў дзве сусветныя вайны і дзве рэвалюцыі, каранямі сыходзіць да канца XIX стагоддзя. Першапачаткова збудаваны як аднапавярховы, ён належаў Міністэрству фінансаў. У тыя часы тут быў адзін з карпусоў былога вытворчага комплексу манапольнага віннага склада.

Паводле архіўных дакументаў, 2-класнае мужчынскае вучылішча са жніўня 1910 года размяшчалася ў асобным каменным флігелі, які быў перададзены Міністэрству народнай асветы пасля закрыцця віннага склада. З гэтага часу пачынаецца гісторыя агульнаадукацыйнай установы. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна захаваўся гістарычны дакумент «Дадатак да справаздачнай ведамасці па Кобрынскаму першаму мужчынскаму 2-класнаму вучылішчу за 1914 год».

У 1911 годзе адкрываецца другое 2-класнае мужчынскае вучылішча ў асобным каменным флігелі, пабудаваным у 1897 годзе за кошт казны. У першым вучылішчы займаліся 99 хлопчыкаў, у другім – 85.



Нягледзячы на назву ўстаноў, меліся ў іх і жаночыя змены, дзе вучыліся 42 дзяўчынкі. Навучаліся пераважна дзеці гараджан і сялян з найбліжэйшых вёсак. Установы давалі толькі пачатковую адукацыю. На працягу двух гадоў дзеці асвойвалі чытанне, пісьмо, асновы Закону Божага, вучыліся лічыць. Акрамя гэтага, выкладалася яшчэ і гімнастыка.

З пачаткам Першай сусветнай вайны заняткі ў вучылішчах спыніліся, а будынкі перадалі пад гаспадарчыя патрэбы. Летам 1915 года Кобрын занялі германскія войскі. У лістападзе 1915 года па ініцыятыве мясцовых памешчыкаў у доме прыходскога святара Хаткоўскага адкрылася польская школа, у якой навучалася 60 дзяцей. У 1917 годзе школу ператварылі ў грамадскую гімназію, апякунскі савет установы дазволіў прымаць дзяцей з сем'яў рознага веравызнання.

У 1919 годзе з прыходам польскага войска грамадская гімназія ператворана ў польскую сярэднюю школу. Вучоба была платнай. За кожны месяц бацькі вучняў павінны былі плаціць ад 40 да 50 злотых (*для параўнання: у той час за гэтыя грошы можна было купіць 400 кг пшаніцы або 50 кг мяса).*



Здание Гимназии до 1924 года



У 1923 годзе ажыццёўлена поўная нацыяналізацыя школы. У 1924 годзе завершана будаўніцтва другога паверха школы, пачатае на грошы польскай пісьменніцы Марыі Радзевіч (1863–1944), якая большую

частку жыцця правяла ў маёнтку Грушава Кобрынскага павета. Першы выпуск школы адбыўся ў 1925–1926 гадах, атэстат сталасці атрымалі 23 выпускнікі.

У 1927 годзе ўстанове прысвоена новая назва - «Дзяржаўная гімназія імя М. Радзевіч». З 1 снежня 1928 года ўводзяцца форма і значкі для навучэнцаў гімназіі.




Гімназісты атрымлівалі трывалыя веды, былі створаны ўсе ўмовы для развіцця featнабаковых інтарэсаў вучняў і падрыхтоўцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Спецыяльныя курсы рыхтавалі настаўнікаў пачатковай школы з мясцовага пісьменнага насельніцтва.



Директор Михаил Фанфара в столярной мастерской (1932г.)

З 1929 года дырэктарам гімназіі стаў Міхаіл Фанфара, фізік па адукацыі. 19 настаўнікаў-прадметнікаў штогод навучалі 250-300 гімназістаў. Акрамя асноўных прадметаў выкладаліся лацінская, польская мовы, прыродазнаўства і пытанні сучаснага жыцця, гімнастыка.

Важнае месца адводзілася рэлігіі. Улічваючы інтарэсы навучэнцаў з сем'яў розных канфесій, святары выкладалі праваслаўную, каталіцкую, іудзейскую рэлігію.

Пры гімназіі імя Марыі Радзевіч працаваў агульна-адукацыйны ліцэй, у якім навучанне доўжылася два гады. Вучоба ў ліцэі, як і ў





На экзамене в лицее, 1938 г.

гімназіі, была платнай, выпускнікі ліцэя атрымлівалі сярэднюю адукацыю. Пасля заканчэння вучобы ў ліцэі неабходна было здаць экзамен на атэстат сталасці, атрыманне якога давала права паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову.

З устанаўленнем савецкай улады ў 1939 годзе гімназію ўзначаліў таварыш Зубаў. Загадам № 6 ад 29 лістапада 1939 года Аляксандр Зубаў з 1 снежня 1939 года быў прызначаны дырэктарам гімназіі, а Міхаіл Фафара (дырэктар польскай гімназіі) - памочнікам дырэктара па вучэбнай частцы. 20 жніўня 1940 года ў будынку гімназіі адкрылася бясплатная сярэдняя школа, у якую прынялі 120 вучняў. Пачалося выкладанне беларускай мовы. З пісьменнага мясцовага насельніцтва рыхтавалі настаўнікаў пачатковай школы, настаўнікаў старэйшых класаў накіроўвалі з усходніх раёнаў Беларусі.

У гэтыя гады значная ўвага надавалася школьнай дысцыпліне. Працоўны рэжым і парадак у школе ляжалі ў аснове вучэбна-выхаваўчага працэсу, адносіўся ён як да настаўнікаў, так і да вучняў. За недысцыплінаванасць, парушэнне правілаў унутранага распарадку навучэнцаў

маглі выключыць са школы, пра што сведчаць загады па раённаму аддзелу народнай адукацыі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў будынку школы размяшчалася нямецкая адміністрацыя – гебітскамісарыят. Пра гэта расказваюць фотаздымкі і ксеракопіі газеты «Урадавы веснік», якая выходзіла на нямецкай і ўкраінскай мовах.



Пасля вызвалення Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 года ў будынку часова размясцілі шпіталь для савецкіх салдат. У маі 1945 года ў двары школы адбылося ўзнагароджанне салдат у сувязі з Перамогай.

Пасля вызвалення горада заняткі былі адноўлены і вучні пайшлі ў савецкую школу, якая дала шмат магчымасцей для рознабаковага навучання дзяцей. Заняткі школьнікаў пачаліся ў будынку па вул. Першамайскай, былі арганізаваны 15 класаў з першага па дзявяты. Пасля



ўрокаў вучні прыходзілі ў шпіталь, каб дапамагчы раненым: прыбіралі, мылі посуд, пісалі лісты, выступалі з канцэртамі. Толькі восенню 1945 года стары будынак школы зноў прыняў дзяцей – з кастрычніка пачаўся першы пасляваенны навучальны год. Дырэктарам школы быў прызначаны Васілій Пятровіч Кандраценка, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Ён кіраваў школай да 1956 года. На той час гэта была адзіная сярэдняя школа ў Кобрыне.













Школьная адукацыя развівалася ва ўмовах савецкай сістэмы рэформаў і мела некаторыя асаблівасці. Так, пры школе быў арганізаваны спецыяльны курс «Аўтасправа», засвоіўшы які, навучэнцы атрымлівалі правы вадзіцеля і нават размеркаванні на працу.

У 1956–1967 гадах дырэктарам школы быў Уладзімір Ігнацьевіч Панасюк, у 1967–1982 – Віктар Сцяпанавіч Качан, у 1982–1995 – Ніна Васільеўна Амельянюк.

  

Напэўна, адной з несумненных адметнасцей першай



школы стала яе газета, ля вытокаў якой стаяла Ніна Сцяпанаўна Дрык, цяпер вядомая як паэтка. Газету пачалі выдаваць у 1996 годзе, і першапачаткова яна называлася «Маладзік». «Маладзіку» атрымалася нават заняць першае месца ў рэспубліцы. Артыкулы з яго друкаваліся ў многіх салідных выданнях, як дзіцячых, так і дарослых; каля двухсот публікацый пабачыла свет у рэспубліканскай прэсе. Пасля, калі Ніна Сцяпанаўна пайшла са школы, газета змяніла сваю назву - называлася «Крыніца», і яе кіраўніком стала Людміла Іванаўна Лазюк, настаўніца рускай мовы і літаратуры, педагог з больш як 40-гадовым стажам.






Вялікая работа праводзілася па вывучэнні замежных моў, у прыватнасці, польскай. Вучні не раз былі ў Польшчы, удзельнічалі ў міжнародных конкурсах на веданне мовы і займалі ў іх высокія прызавыя месцы. Французская дэлегацыя таксама некалькі разоў прывозіла сваіх вучняў, а кобрынскія вучні наведвалі Францыю.

# СУЧАСНЫ ДЗЕНЬ ШКОЛЫ



Сёння дзяржаўная ўстанова адукацыі
«**Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына**» -
Гэта **Ц Э Н Т Р**:

• атрымання сучасных ведаў;
• выхавання патрыёта і грамадзяніна сваёй Радзімы;
• выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у адукацыйным працэсе;
• развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў;
• рэалізацыі разнастайных інтарэсаў вучняў;
• атрымання дадатковай адукацыі;
• прапаганды здаровага ладу жыцця.

У 2001/2002 навучальным годзе ў школе створаны профільны клас (8 «А») з выкладаннем фізікі, матэматыкі, інфарматыкі на павышаным узроўні.

У 2002/2003 навучальным годзе на аснове дагавора з Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам імя А. С. Пушкіна створаны ліцэйскі клас (8 «А»), матэматычны профіль.

З 2003/2004 навучальнага года школа ўдзельнічае ў здароўе-зберагальным эксперыменце «Модульная арганізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу».

З 2005 года школа перайшла на 5-дзённы вучэбны тыдзень.

Да 2006/2007 года завершаны паэтапны пераход на навучанне дзяцей па праграме 10-гадовай базавай школы.

Да 2008 года завершана рэфармаванне школы III ступені па навучальных праграмах 12-гадовай школы.

У 2008 годзе праведзены капітальны рамонт асноўнага будынка школы і пабудавана новая спартыўная зала, якая дазваляе праводзіць спаборніцтвы раённага маштабу па гульнёвых відах спорту. Зала ўладкавана такім чынам, што тут можна па ўсіх правілах згуляць у міні-футбол, валейбол, баскетбол, ёсць сілавыя трэнажоры. Прадугледжаны раздзявальні, душавыя кабіны. З ахвотай хлопцы і дзяўчаты наведваюць разнастайныя секцыі. Важнае месца ў рабоце школы займае спартыўная і фізкультурна-аздараўленчая работа. З прыходам у школу Алега Уладзіміравіча Калтунчыка спартыўная каманда дзяўчат па валейболе і стрытболе стала пераможцам раённых і абласных спаборніцтваў.

У школе абсталяваны прадметныя кабінеты, майстэрні, бібліятэка, актавая зала, сталовая, ёсць спецыяльныя кабінеты для індывідуальных заняткаў лагапеда і дэфектолага. Створана лакальная сетка, якая звязала ўсіх карыстальнікаў адзіным інфармацыйным патокам. Асноўным інфармацыйным рэсурсам з'яўляецца сайт школы (sch1.kobrin.edu.by). На яго старонках можна даведацца пра тое, чым жыве школа, а таксама наведаць віртуальны музей школы.




У 2010 годзе на імпрэзу 100-гадовага юбілею ўстановы з’ехаліся выпускнікі не толькі з усёй Беларусі, але і з Польшчы. Убачыць «сваю гімназію» выявілі жаданне некалькі палякаў, якія вучы-

ліся ў ёй да Другой сусветнай вайны. 90-гадовыя выпускнікі гімназіі прывезлі незвычайныя падарункі, якія гарманічна ўпісаліся ў музейную экспазіцыю школы.

Свята адбылося з удзелам выпускнікоў і вучняў школы. У той урачысты дзень немагчыма было пералічыць усіх таленавітых людзей, якім дала пуцёўку ў жыццё школа-юбіляр. Многія выпускнікі з'яўляюцца гонарам не толькі школы, але і краіны, а таксама вядомы па-за яе межамі. Дырэктар школы Аляксандр Хурсін прывёў выдатныя словы Гётэ: «*Вучацца ў тых, каго любяць*». Гэта было гістарычнае для школы свята, на якім прысутнічалі выпускнікі розных гадоў і іх настаўнікі.

Галоўная каштоўнасць школы - безумоўна, калектыў. Без яго нават самая высокакласная матэрыяльная база не дазволіць выканаць важную і складаную задачу школы - навучыць і выхаваць.



Педагагічны калектыў школы налічвае 51 супрацоўніка, сярод якіх адзін выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (Хурсін А. Д.), 27% педагогаў маюць вышэйшую катэгорыю, 60,8 % - першую катэгорыю, 5,9% - другую катэгорыю. За час працы школы назапашаны сур'ёзны педагагічны, метадычны, прафесійны вопыт. Сфарміраваўся працаздольны калектыў з творчым патэнцыялам, для якога характэрна аптымальнае спалучэнне здаровага кансерватызму і пачуцця новага. Педагогі школы - гэта мудрыя, добрыя, прафесійныя людзі.

З 1995 года і па сённяшні час дырэктарам сярэдняй школы № 1 з’яўляецца Аляксандр Дзмітрыевіч Хурсін.



Дарэчы, ва ўстанове шэсць педагогаў з'яўляюцца яе выпускнікамі: Ю. М. Коваль, Д. С. Самасюк, А. Г. Саўчук, Г. А. Сідарук, І. В. Шыцікава, А. Д. Хурсін.

Сёння ў школе навучаецца 414 вучняў. Сярод вучняў школы - пераможцы алімпіяд самага рознага ўзроўню, выдатныя спартсмены, прызёры конкурсаў і выдатнікі вучобы.



У школе дзейнічаюць дзіцячыя і маладзёжныя грамадскія арганізацыі БРПА, БРСМ. Яны прымаюць самы непасрэдны ўдзел ва ўсіх школьных і раённых мерапрыемствах. Акрамя таго, найбольш актыўныя навучэнцы 10-11 класаў наведваюць школу маладога кіраўніка, якая дзейнічае пры Кобрынскім райвыканкаме.

На працягу апошніх гадоў вучні школы з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі і пераможцамі Усебеларускай маладзёжнай акцыі «Маршрутамі памяці. Маршрутамі адзінства» *(2023 год - дыплом I ступені, 2024 год - дыплом II ступені).*









Анастасія Гольцман і Марына Арывановіч прымалі ўдзел у конкурсе праектаў «100 ідэй для Беларусі», на раённым і абласным этапе конкурсу іх праект быў адзначаны Дыпломам I ступені і прадстаўлены на рэспубліканскім этапе (кіраўнік праекта Радчук І. М.). Вучань Арсеній Бойка у 2024 годзе прадстаўляў Брэсцкую вобласць на форуме «Дзеці садружнасці» ў Кыргыстане.

Паступленне ў вышэйшыя навучальныя ўстановы выпускнікоў школы на працягу апошніх пяці гадоў складае ад 40 да 50 працэнтаў. Усе яны захоўваюць у памяці сваю школу, і, можа, у свой час у чарговы раз праславяць яе.

# ЗАХАВАЛЬНІК ГІСТОРЫІ – ШКОЛЬНЫ МУЗЕЙ

Слаўныя старонкі гісторыі школы, яе дасягненні і традыцыі, памяць пра мінулае, культуру беларускага народа беражліва захоўвае школьны музей школы.

У сярэдняй школе № 1 працуе комплексны музей



«Кладоўка спадчыны». Першая экспазіцыя, якая была створана ў 2003 годзе, называлася «Беларуская хатка» і мэтай яе дзейнасці з'яўляецца захаванне памяці пра мінулае, культуру, быт, традыцыі беларускага народа.

Адзін з кабінетаў школы ператварыўся ў сапраўдны дом і не просты дом, а нацыянальны, беларускі. Асноўныя раздзелы экспазіцыі: «Прадметы хатняга ўжытку», «Гаспадарчыя прылады працы», «Ткацтва», «Беларускі нацыянальны касцюм», «Беларускі ручнік», «Беларуская вышыўка».




Музейны пакой прыдумалі і заснавалі настаўнікі беларускай мовы і літаратуры Н. С. Дрык, В. У. Іонава, з 2018 года яго ўзначаліла Н. І. Шусціцкая. Экспанаты для музея збіраліся з усіх куткоў Кобрынскага раёна.

У 2010 годзе, да 100-гадовага юбілею школы, адкрылася экспазіцыя «Гісторыя школы даўжынёю ў стагоддзе», стваральнікамі якой з'яўляюцца Р. М. Макравус, Н. В. Рагачук, А. І. Качан.




Была распачата карпатлівая праца па збіранні інфармацыі пра дзейнасць школы ў розныя перыяды гісторыі. Работа вялася ў Гродзенскім, Брэсцкім архівах, многа звестак пра дзейнасць школы як гімназіі было знойдзена ў адным з архіваў Польшчы, таксама былі выкарыстаны дакументы аддзела адукацыі, спорту і турызму Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта. Паступова разгортвалася гістарычнае жыццё ўстановы, знаходзіліся звесткі пра выпускнікоў, якія сталі знакамітымі па-за межамі краіны. Напярэдадні 100-годдзя школы, апрацаваўшы велізарную колькасць архіўных дакументаў, распрацаваўшы дызайн і змест кожнага са стэндаў экспазіцыі, настаўніцы прадставілі ўсім невялікі музей.

Экспазіцыя пабудавана такім чынам, каб адлюстраваць асноўныя этапы дзейнасці школы як навучальнай установы. Спачатку можна пазнаёміцца з прыходскімі вучылішчамі, жыццём іх настаўнікаў і вучняў. Далей адзін са стэндаў расказвае пра гімназію імя М. Радзевіч, у якую была перайменавана школа. Мармуровая лесвіца, што была пабудавана на сродкі пісьменніцы, з’яўляецца адным з самых значных экспанатаў музея. Каштоўнымі з’яўляюцца лісты выпускнікоў-палякаў, значкі гімназістаў, атэстаты, правы веласіпедыстаў. Пра тое, што ў час Вялікай Айчыннай вайны ў школе нямецкія салдаты арганізавалі гебітскамісарыят, расказваюць фотаздымкі і ксеракопіі газеты «Урадавы веснік». У пасляваенны час пры школе

быў арганізаваны спецыяльны курс «Аўтасправа», і адзін з экспанатаў - першыя вадзіцельскія правы дырэктара школы А. Д. Хурсіна. Стваральнікі музея значную ўвагу надалі і тым настаўнікам, якія ваявалі, ім прысвечаны асобны раздзел у экспазіцыі «Яны прайшлі дарогамі вайны». Многія з выпускнікоў школы сталі вядомымі людзьмі, таму іх імёны назаўсёды ўвайшлі ў музейны летапіс.

Да працы стваральнікаў музея былі далучаны і дзеці. Арганізаваны клуб «Імпульс», удзельнікамі якога з’яўляюцца юныя экскурсаводы-даследчыкі. Дзеці не толькі праводзяць экскурсіі, але і старанна шукаюць экспанаты для фонду музея. Так, музей, акрамя выключна пазнавальнай, мае і чыста практычную мэту - з'яўляецца прыкладам таго, як творчасць і намаганні настаўнікаў паступова пераходзяць у творчасць вучняў, якія на прыкладзе сваёй роднай школы спазнаюць гісторыю роднага краю. Музейная экспазіцыя «Гісторыя школы даўжынёю ў стагоддзе» стала цэнтрам даследчай, творчай дзейнасці навучэнцаў. У 2025 годзе да 115-гадовага юбілею школы створана яшчэ адна старонка летапісу школы: «Наша ў 2011 - 2020 гг.».



Віртуальны музей на сайце школы ў 2018 годзе быў прызнаны лепшым у Брэсцкай вобласці. Ён стаў першым лічбавым рэсурсам такога тыпу і даў магчымасць узаемадзейнічаць з рознымі пакаленнямі выпускнікоў. А такія ўзаемадзеянні часцей за ўсё даюць новыя аповеды, цікавыя факты і нават экспанаты.



# ЗНАКАМІТЫЯ ВЫПУСКНІКІ ШКОЛЫ




Школа ганарыцца сваімі выпускнікамі. Многія з іх дасягнулі поспехаў ў навуцы, вытворчасці, сталі пісьменнікамі, журналістамі, ваеннымі… Шмат з іх добра вядомыя як на Кобрыншчыне, так і далёка за яе межамі.



**АМЕЛЬЯНЮК Георгій Георгіевіч** - кандыдат біялагічных навук, доктар юрыдычных навук, прафесар. Нарадзіўся 10 снежня 1966 года ў г. Кобрыне. Яшчэ ў школьныя гады вучань сярэдняй школы № 1 Георгій Амельянюк выяўляў цікавасць да навукова-пазнавальнай літаратуры, быў старшынёй вучэбнага камітэта, уваходзіў у склад зборнай горада па валейболе, займаў прызавыя месцы ў спаборніцтвах па спартыўнаму шматбор'ю, іграў на бас-гітары ў ансамблі «Чырвоная гваздзіка». Георгій быў пераможцам ва ўсіх школьных алімпіядах, прызёрам гарадскіх алімпіяд па хіміі, матэматыцы і беларускай мове. Закончыў школу ў 1983 годзе. Глыбокія веды і эрудыцыя дапамаглі кобрынскаму школьніку ў няпоўных 17 гадоў

стаць самым маладым студэнтам Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ламаносава (МДУ). Пасля заканчэння з адзнакай МДУ і аддзялення аспірантуры, з'явіліся першыя публікацыі тэзісаў навуковых дакладаў Георгія Амельянюка. Працуючы ў філіяле Усесаюзнай акадэміі сельскай гаспадарцы ў Маскве, 25-гадовы выпускнік аспірантуры атрымаў навуковую ступень кандыдата біялагічных навук. У 1992 годзе абараніў дысертацыю па тэме «Влияние орошения на гумусное и агрегатное состояние степных почв». У 1991 годзе Г. Г. Амельянюку прапанавалі працу ў экспертна-крыміналістычным цэнтры Міністэрства ўнутраных спраў (МУС), дзе ён прайшоў шлях ад вядучага навуковага супрацоўніка да намесніка начальніка навукова-даследчай лабараторыі, атрымаўшы званне падпалкоўніка міліцыі. Працуючы ў цэнтры, Георгій Георгіевіч завочна закончыў Маскоўскі юрыдычны інстытут. За гады працы ў экспертна-крыміналістычным цэнтры Міністэрства ўнутраных спраў Г. Г. Амельянюк быў узнагароджаны Ганаровым знакам МУС «За верность долгу», «Знаком Георгия», медалём «За образцовую службу». У 2004 годзе перайшоў на працу ў Міністэрства юстыцыі, праз год абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Концептуальные основы судебно-почвоведческой экспертизы», пасля чаго ўзначаліў лабараторыю ў Расійскім федэральным цэнтры судовай экспертызы пры Міністэрстве юстыцыі Расіі. Апублікаваў больш за 200 навуковых прац, у тым ліку пяць кніг і адну манаграфію. З 2009 года - эксперт па акрэдытацыі аналітычных лабараторый. Сваю навуковую працу доктар юрыдычных навук спалучае з навукова-выкладчыцкай. Прафесар кафедры судовай экалогіі Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў, прафесар кафедры «Город и оздоровление окружающей среды» Маскоўскай дзяржаўнай акадэміі камунальнай гаспадаркі і будаўніцтва. Валодае французскай і англійскай мовамі.



**БОЎБЕЛЬ Яўгеній Іванавіч** (1941-2008) - радыёфізік, кандыдат фізіка-матэматычных навук. Нарадзіўся 23 верасня 1941 года ў горадзе Кобрыне. Вучыўся ў сярэдняй школе № 1, якую закончыў у 1958 годзе. У 1960 годзе паступіў у Мінскі радыётэхнічны тэхнікум, які толькі што быў створаны. Па яго заканчэнні быў прызваны на тэрміновую службу ў Савецкую армію. Пасля дэмабілізацыі Яўгеній Боўбель - студэнт БДУ, які закончыў у 1970 годзе. Як адукаванага і практычнага чалавека, які вылучаўся сярод астатніх працаздольнасцю, зацікаўленасцю да працы, Яўгенія Боўбеля запрашаюць працаваць ва ўніверсітэце. Працаваў выкладчыкам на кафедры радыёфізікі і электронікі БДУ, вучыўся ў аспірантуры, рыхтаваў дысертацыю. Пасля паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі «Исследование функции неопределенности неузкополосных сигналов численными методами» (1976) Я. І. Боўбелю была прысвоена навуковая ступень кандыдата фізіка-матэматычных навук. З 1976 года па 1990 год Яўгеній Іванавіч – дацэнт кафедры радыёфізікі, намеснік дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ. Вучоны ўнёс вялікі ўклад у адно з прыярытэтных напрамкаў даследаванняў кафедры – арганізацыю і правядзенне інфармацыйных тэхналогій і камп’ютарна-арыентаваных сістэм апрацоўкі сігналаў рознай фізічнай прыроды і прызначэння. На яго рахунку больш за 200 навуковых прац, якія апублікаваны ў міжнародных часопісах. Навуковы кіраўнік пяці праектаў міжнароднага навукова-тэхнічнага цэнтра ў Маскве. Я. І. Боўбель – ганаровы прафесар Ліёнскага ўніверсітэта, прафесар кафедры інфарматыкі Вышэйшай школы г. Ліёна (Францыя). Амерыканскі Біяграфічны Інстытут (АБІ) узнагародзіў Я. І. Боўбеля медалём гонару «2000 Mileniym».



**БУЙНОЎСКАЯ (Дружылоўская) Ангеліна Анатольеўна** - кандыдат медыцынскіх навук (1986), урач-арганізатар аховы здароўя І кваліфікацыйнай катэгорыі. Нарадзілася 5 красавіка 1955 года ў г. Кобрыне. Выпускніца 1972 года сярэдняй школы № 1. Ангеліна ўзнагароджана медалём «Юны ўдзельнік ВДНГ». У 1972 годзе паступіла ў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (МДМІ), які закончыла з адзнакай па спецыяльнасці «Лячэбная справа». Працавала старшым навуковым супрацоўнікам лабараторыі калагенозаў Цэнтральнай навукова-даследчай лабараторыі МДМІ. У 1978-1990 гадах – лячэбна-кансультатыўная і навуковая работа ў галіне рэўматалогіі на базе 2-й кафедры ўнутраных хвароб МДМІ. У 1986 годзе Ангеліне Анатольеўне прысуджана вучоная ступень кандыдата медыцынскіх навук. У 1990-1991 гадах А. А. Буйноўская - загадчыца паліклінічнага аддзялення медыцынскай службы Цэнтральнай групы войскаў у Чэхаславакіі. У 1991-1997 гадах яна – урач-кансультант, урач-рэфлексатэрапеўт медыцынскай фірмы «Авіцэна» і Мінскага гарадскога эндакрыналагічнага дыспансэра. З 1997 па 2002 год працавала намеснікам дырэктара па медыцынскай частцы САК «Юнацтва» Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З 2002 года – галоўны ўрач рэабілітацыйнага цэнтра «Дом Міласэрнасці» рэлігійнай абшчыны «Прыход у гонар Усіх Святых» Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай царквы. Узнагароджана ордэнам Рускай Праваслаўнай Царквы ў гонар прападобнага Серафіма Сароўскага. Галоўны спецыяліст па медыцынскаму турызму «Цэнтра па санаторна-курортнай рабоце ЦЭНТР КУРОРТ» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



**ГАПАСЮК Сцяпан Ільіч** (1930-2005) - доктар фізіка-матэматычных навук, астрафізік, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны. Нарадзіўся 7 ліпеня 1930 года ў вёсцы Лягаты Кобрынскага павета (цяпер Кобрынскага раёна) у сялянскай сям'і. Вучыўся ў сярэдняй школе № 1 Кобрына. Адоранага і таленавітага вучня накіроўваў і падтрымліваў любімы настаўнік рускай мовы і літаратуры Міхаіл Ільіч Кірылаў, заслужаны настаўнік БССР, удзячнасць да якога С. Гапасюк пранёс праз усё жыццё. Два апошніх класы Сцяпан закончыў за адзін год, у 1949 годзе экстэрнам здаў экзамены за курс сярэдняй школы. Паспяхова былі здадзены і ўступныя іспыты, Сцяпан Гапасюк стаў студэнтам фізічнага факультэта Львоўскага ўніверсітэта імя І. Франко. Пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў у Крымскай астрафізічнай абсерваторыі Акадэміі навук СССР. У 1963 годзе Сцяпан Ільіч абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Развитие вспышек и магнитные поля на Солнце», у 1975 годзе – доктарскую «Магнитные поля и движения в атмосфере Солнца». З 1967 года С. І. Гапасюк з'яўляўся членам Міжнароднага астранамічнага саюза (МАС), двойчы выбіраўся членам прэзідыума камісіі 12 МАС, быў членам Навуковай рады па праблеме «Астраномія» аддзялення фізікі і астраноміі НАН Украіны. У 1987-1989 гадах Сцяпан Ільіч узначальвае лабараторыю фізікі Сонца, з 1989 года стаў галоўным навуковым супрацоўнікам Крымскай астрафізічнай абсерваторыі. Сцяпану Ільічу давялося сустракацца і з канструктарам С. Каралёвым, і з першым касманаўтам Ю. Гагарыным. Ён апублікаваў больш за 200 навуковых работ, якія прызнаны сусветнай грамадскасцю. Падрыхтаваў шэсць кандыдатаў навук, кіраваў навуковымі праектамі Міністэрства адукацыі

і навукі Украіны і быў аўтарам двух касмічных праектаў. Навуковая дзейнасць С. І. Гапасюка атрымала прызнанне і высокую адзнаку. Сцяпану Ільічу прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Украіны. У кнізе «500 асоб Крыма» з цыкла «Жыццё выдатных людзей Крыма» яму прысвечана частка старонак. Імем С. І. Гапасюка названа адна з малых планет (8783 Gopasyuk), адкрытая 13 сакавіка 1977 года.



**ДАВЫДЗЮК Сцяпан Іосіфавіч** – заслужаны трэнер па шахматах, выдатнік адукацыі Беларусі, майстар ФІДЭ, аўтар і рэдактар многіх выданняў для кіраўнікоў шахматных гурткоў, літаратар. Нарадзіўся ў Кобрыне 25 верасня 1947 года. Выпускнік 1965 года школы № 1 г. Кобрына. Закончыў хіміка-біялагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Першым месцам работы маладога настаўніка стала Дзівінская школа-інтэрнат. У 27 гадоў стаў майстрам спорту СССР па шашках. З 1973 года, больш за 40 гадоў, працаваў трэнерам па шахматах у комплекснай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву г. Кобрына. Да цяперашняга часу колькасць кніг па шахматах, выдадзеных С. Давыдзюком, набліжаецца да трох дзясяткаў. У асноўным гэта вучэбна-метадычная літаратура для юных шахматыстаў, якія выдадзены на польскай, рускай, чэшскай мовах. Не адно пакаленне юных беларускіх шахматыстаў, у тым ліку і тых, якія пасля сталі майстрамі і гросмайстрамі, вучылася на кнігах Сцяпана Іосіфавіча. Ёсць у яго і кнігі іншай тэматычнай накіраванасці. Аўтар складае вясёлыя апавяданні, піша анекдоты, вершы. Сцяпан Іосіфавіч не толькі сам піша, але і дапамагае выдаваць зборнікі землякам.



**ДАРОШАК (Новік) Любоў Васільеўна** – дацэнт Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, спецыяліст па менеджменту. Выпускніца 1964 года сярэдняй школы № 1 г. Кобрына. Закончыла школу з залатым медалём і ў той жа год паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння ўніверсітэта была размеркавана на работу ў навукова-даследчы інстытут пры Дзяржплане БССР. Потым практычна ўсё жыццё (з 1974 па 2007) Л. В. Дарошак звязана з выкладаннем у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі (цяпер Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт). Прайшла шлях ад асістэнта да дацэнта ўніверсітэта. У 1975-1977 гадах Любоў Васільеўна працавала ў сумеснай фінска-савецкай фірме «Elorq-Дата» ў г. Хельсінкі, у 1988-1990 – у консульскім аддзеле пасольства СССР у Фінляндыі. Але заўсёды яна вярталася ў свой інстытут. З 2007 года Л. В. Дарошак працуе ў Прыватным інстытуце кіравання і прадпрымальніцтва.



**КАБАТА Збігнеў** (1924-2014) - вучоны-іхтыёлаг, выбітны польскі, брытанскі і канадскі паразітолаг. Нарадзіўся 17 сакавіка 1924 года ў в. Яромічы Кобрынскага павета Палескага ваяводства (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сям'і польскага афіцэра. Вучыўся ў дзяржаўнай гімназіі імя М. Радзевіч у Кобрыне, якую закончыў у 1937 годзе. Ва ўзросце 13 гадоў Збігнеў паступіў у Кадэцкую ваенную акадэмію імя маршала Пілсудскага ў г. Львове, але не паспеў закончыць яе ў

сувязі з пачаткам Другой сусветнай вайны. У 1939 годзе З. Кабата далучыўся да руху Супраціву. З'яўляўся ўдзельнікам дыверсійных акцый, рэдактарам, друкаром, разносчыкам падпольнай прэсы «Odwet», аўтарам партызанскіх песень і вершаў, неафіцыйнага гімна руху Супраціву. У 1945 годзе апынуўся ў Італіі, дзе далучыўся да Арміі Краёвай. У 1946 годзе разам са сваім корпусам быў перамешчаны ў Вялікабрытанію, дзе пасля заканчэння шасцімесячных курсаў рыбакоў, працаваў на камерцыйных рыбалоўных судах у Паўночным моры. Збігнеў стаў паспяховым студэнтам у вобласці марской біялогіі. Атрымаў доктарскую ступень ва Універсітэце Абярдзіна (Шатландыя), абараніў доктарскую навуковую працу «Паразіталогія марскіх рыб». Пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў у марской лабараторыі Шатландскага аддзела сельскай гаспадаркі і рыбалоўства ў Абярдзіне. У 1966 годзе З. Кабаце прысвоена званне доктара біялагічных і філасофскіх навук. Як прызнанне заслуг Кабаты, яго імем названа некалькі дзясяткаў марскіх істот. На працягу 15 гадоў Збігнеў быў членам Міжнароднай камісіі па заалагічнай наменклатуры. Чытаў лекцыі ва ўніверсітэтах Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Індыі. З 1967 года жыў у Канадзе. На працягу 15 гадоў быў членам Міжнароднай камісіі па заалагічнай наменклатуры. У 1984 годзе стаў заснавальнікам і прэзідэнтам Міжнароднай асацыяцыі капепадалогаў. Адзначаны шматлікімі медалямі за прафесійную і грамадскую дзейнасць, сярод якіх узнагароды Канадскага грамадства заолагаў, Польскага паразіталагічнага грамадства. З. Кабата аднагалосна выбраны ганаровым членам Паразіталагічнага грамадства пры Расійскай АН (1995). У 1996 годзе навукоўцу ўручаны Вялікі крыж Ордэна Адраджэння Польшчы і прысвоена званне Ганаровага доктара сельскагаспадарчага ўніверсітэта ў Шчэціне. Выбраны ганаровым прэзідэнтам Кангрэса паразітолагаў у Ванкуверы (2002).



**КОЛБАС (Куц) Наталля Юр’еўна** – кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры біялагічных і хімічных дысцыплін.

Нарадзілася ў 1978 годзе ў г. Кобрыне. Выпускніца 1995 года сярэдняй школы № 1, якую закончыла з залатым медалём. У школьныя гады Наталля цікавілася гісторыяй і фізікай, у вольны час займалася танцамі ва ўзорным танцавальным калектыве «Пралесачкі». Вучылася ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, які закончыла ў 2000 годзе.

У 2013 годзе Н. Ю. Колбас абараніла кандыдацкую дысертацыю «Антоциановый комплекс и антиоксидантная активность плодов некоторых представителей семейства Розоцветные (Rosaceae Juss)». У 2016 годзе прысвоена вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці «Фізіка-хімічная біялогія» Працуе загадчыкам кафедры хіміі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Аўтар 145 навуковых публікацый, 25 вучэбна-метадычных выданняў.



**ЛАГАНЧУК *Леанід Міхайлавіч*** – кандыдат тэхнічных навук, дацэнт. Нарадзіўся 25 красавіка 1930 года. У 1948 годзе Леанід Лаганчук закончыў сярэднюю школу № 1 г. Кобрына.

Леанід Міхайлавіч - выкладчык, дацэнт кафедры «Аўтаматызаваныя электра-энергетычныя сістэмы» Нова-чаркаскага політэхнічнага інстытута.



**ЛУКАШУК Аляксандр Алегавіч** - беларускі біёлаг, энтамолаг. Старшы навуковы супрацоўнік Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

Нарадзіўся 25 мая 1964 года ў вёсцы Шыповічы Кобрынскага раёна. Прыгажосць і ўнікальнасць прыроды адкрылі юнаму даследніку біёлагі СШ № 1 г. Кобрына, дзе Аляксандр вучыўся з 1971 да 1981 года, і педагогі станцыі юннатаў, гурткі якой хлопчык наведваў пасля ўрокаў. Сувязь з юннатаўскім рухам ён не страціў да гэтага часу, ужо многія гады Аляксандр Лукашук з'яўляецца членам журы злёту юных эколагаў Беларусі і Расіі. Ва ўніверсітэце, куды Аляксандр паступіў пасля года працы ў будаўнічай брыгадзе Кобрынскага інструментальнага завода, у яго завязалася супрацоўніцтва з доктарам біялагічных навук, прафесарам І. Лапаціным, які і адкрыў дапытліваму студэнту свет насякомых ва ўсёй яго загадкавасці і непаўторнасці, а таксама пазнаёміў з адным з лепшых спецыялістаў І. Кержнерам з Заалагічнага інстытута Расійскай акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу. Дзякуючы садзейнічанню і падтрымцы навуковых кіраўнікоў, Аляксандр змог пабываць у шматлікіх экспедыцыях у розных краінах. У 1987 годзе паступіў на працу ў Бярэзінскі біясферны запаведнік. У 1989 годзе закончыў біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Аляксандр Лукашук мае вопыт палявой і лабараторнай работы ў Беларусі, краінах блізкага і далёкага замежжа ў лясных, горных абласцях. Апублікаваў больш за 70 навуковых і навукова-папулярных работ. Прайшоў шлях ад лабаранта да старэйшага навуковага супрацоўніка, вывучаючы насякомых, асабліва паўцвёрдакрылых, знайшоў новыя віды для Бярэзінскага запаведніка, для краіны і для навукі.



**МАРТЫНАЎ Аляксей Міхайлавіч** (1904-1999) - краязнавец, гісторык, публіцыст, грамадскі дзеяч, ганаровы грамадзянін горада Кобрына.

Нарадзіўся 20 жніўня 1904 года ў горадзе Кобрыне ў сям'і народнага настаўніка. Аляксей Міхайлавіч і яго сям'я ў свой час мелі самае прамое дачыненне да школы № 1: тут у свой час працаваў яго бацька, тут вучыўся ён сам і яго будучая жонка. У 1911-1915 гадах Аляксей вучыўся ў Кобрынскім прыходскім вучылішчы. Немагчыма ўявіць наш горад без устаноў, якія з'явіліся пры непасрэдным удзеле і намаганнях А. М. Мартынава. Гэта гарадская бібліятэка, якая была арганізавана пад кіраўніцтвам Аляксея Міхайлавіча ў 1939 годзе і адноўлена пасля вызвалення Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; вузел сувязі, у станаўленні якога ён прымаў самы актыўны ўдзел. Па ініцыятыве Мартынава ў 1948 годзе быў заснаваны парк культуры і адпачынку імя А. В. Суворава. У 1960 годзе ён арганізаваў раённае аддзяленне таварыства аховы прыроды, помнікаў гісторыі і культуры. Але, безумоўна, самым значным дасягненнем нашага земляка было стварэнне ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава, які стаў справай усяго яго жыцця. Даследаваў мінулае роднага горада, напісаў больш за 70 артыкулаў, публікаваўся ў рэспубліканскіх і мясцовых органах друку. Унёс вялікі ўклад у захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей Кобрынскага раёна, быў ініцыятарам увекавечання месцаў, звязаных з гістарычнымі падзеямі на Кобрыншчыне. За актыўную краязнаўчую работу ўзнагароджаны медалём імя Н. К. Крупскай, мноствам грамат, імяннымі падарункамі. У 1997 годзе Аляксей Міхайлавіч Мартынаў удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына».



Імя **Паўла Аляксандравіча МІХАЙЛАВА**, сумленнага даследчыка і адоранага педагога, лінгвіста, добра вядомае навукоўцам і выкладчыкам у Беларусі і далёка за яе межамі. Грунтоўныя веды, акадэмічны вопыт дазваляюць заслужана лічыць П. А. Міхайлава адным з вядучых дыялектолагаў Беларусі. Нарадзіўся Павел 13 кастрычніка 1950 года ў вёсцы Ушкавіца Кобрынскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1968 годзе закончыў сярэднюю школу № 1 г. Кобрына, у 1971 годзе, пасля службы ва ўзброеных сілах, паступіў на філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. У студэнцкія гады з'явіліся яго першыя публікацыі. Педагагічны інстытут П. Міхайлаў закончыў з адзнакай у 1975 годзе. Пасля некалькіх месяцаў працы настаўнікам рускай і беларускай моў і літаратур у Лелікаўскай сярэдняй школы Кобрынскага раёна (1975) П. А. Міхайлаў падаў дакументы для паступлення ў аспірантуру Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР. У лістападзе 1975 года быў залічаны ў аспірантуру Інстытута мовазнаўства па спецыяльнасці «Беларуская мова». Вынікам самаадданай і карпатлівай навуковай працы стала паспяховая абарона ў 1981 годзе дысертацыі на тэму «Лексіка беларускіх ганчароў» на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам сектара дыялекталогіі (1976-1982), вучоным сакратаром (1982-1986), загадчыкам аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР (1986-1991). У верасні 1991 года Павел Аляксандравіч атрымаў пасаду дацэнта кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педінстытута імя А. М. Горкага, а яшчэ праз два гады стаў загадчыкам гэтай кафедры і ўзначальваў яе

паўтара дзесяцігоддзя. Менавіта яго намаганнямі кафедра стала адным з найбольш вядомых навукова-педагагічных цэнтраў краіны. Павел Аляксандравіч - аўтар больш за 140 навуковых і навукова-метадычных прац па разнастайных актуальных пытаннях сучаснай беларускай лінгвістычнай і метадычнай навукі. Ён вучоны сакратар савета па абароне дысертацый пры БДПУ імя Максіма Танка, член вучоных саветаў універсітэта і факультэта беларускай філалогіі і культуры. Актыўны ўдзел прымаў у падрыхтоўцы шэрагу праектаў у галіне беларускай дыялектаграфіі, у падрыхтоўцы міжнародных навуковых праектаў. Узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», граматамі.



**МІХУТА Ігар Юр'евіч** – кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў горадзе Кобрыне. Выпускнік 2002 года СШ № 1. Закончыў факультэт фізічнага выхавання Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. У аспірантуры гэтай ВНУ распрацоўваў сістэму прафесійнага адбору супрацоўнікаў сілавых структур і спецыяльных падраздзяленняў да відаў экстрэмальнай дзейнасці. У 2012 годзе працаўладкаваўся ў Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. У 2019 годзе стаў лепшым на міжнародным конкурсе навукова-метадычных распрацовак маладых выкладчыкаў педагагічных ВНУ, каледжаў і арганізацый дадатковай прафесійнай педагагічнай адукацыі дзяржаў-удзельніц СНД «Вучымся вучыць». Трэнер па фізічнай падрыхтоўцы, аўтар больш за 130 навуковых прац па праблематыцы псіхафізічнага патэнцыялу чалавека сродкамі каардынацыйнай трэніроўкі.



**ПАЛЬВІНСКАЯ (Нікіценка) Святлана Іванаўна** - чэмпіёнка БССР сярод школьнікаў па лёгкай атлетыцы, удзельніца Спартакіяды народаў СССР у Маскве ў 1956 годзе. У 13 гадоў яна ўжо стала чэмпіёнкай вобласці, у 16 – чэмпіёнкай рэспублікі па кіданні кап’я. Выпускніца 1955 года СШ № 1. Сур’ёзная траўма не дазволіла займацца спортам, аднак засталася трэнерская работа. Выкладала фізкультуру ў СШ № 1, потым у СШ № 5, СШ № 6 г. Кобрына. Паўстагоддзя прысвяціла спорту і фізкультуры і дабілася ў сваёй справе выдатных вынікаў.



**СІДАРУК Ігар Фёдаравіч** – драматург, празаік, аўтар паэтычных выданняў. Нарадзіўся 23 ліпеня 1964 года ў горадзе Кобрыне. Выпускнік 1981 года СШ № 1. Закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна ў 1986 годзе. Асвоіў спецыяльнасці ад грузчыка, заліўшчыка гарачага металу ў ліцейным цэху да настаўніка, карэспандэнта незалежнай і дзяржаўнай прэсы. Некаторы час настаўнічаў на Салігоршчыне. Працаваў у газетах «Кобрынскі веснік», «Брестский курьер» (1988–1992). У 1990–2000 гадах – загадчык літаратурна-драматычнай часткі ў Брэсцкім абласным тэатры лялек. З 2002 года па 2006 год займаўся прадпрымальніцкай дзейнасцю. У літаратуры Ігар Сідарук

вядомы як паэт і драматург, шмат піша для дзяцей. Асноўны жанр літаратурнай творчасці Ігара Сідарука – драматургія. Яго пяру належаць п’есы «Галава», «Прыгоды Люстрынкі, ці Несусветнае забойства», «Янка Зух і нячысты дух», «Штукары», «Збавіцель», «Плач, саксафон» і інш. Асобную, змястоўную старонку творчасці Ігара Фёдаравіча складае дзіцячая драматургія. Найбольш пашыраным у ёй з’яуляецца жанр драматычнай п’есы-казкі, дзе аўтар здолеў сказаць самабытнае слова. П'есы Ігара Сідарука сваімі мастацкімі і этычнымі вартасцямі заслужылі месца ў школьнай праграме. У тэатрах лялек Беларусі пастаўлены яго «Меч Анёла» (1993), «Янка - зух і нячысты дух» (1993), «Завадныя парасяткі» (1994), «Збавіцель» (1994), «Штукары» (1994). І. Сідарук – адзін са стваральнікаў літаратурнага аб’яднання «Таварыства Вольных Літаратараў», з 2013 года – член Саюза беларускіх пісьменнікаў. Ігар Фёдаравіч друкуецца ў газетах «Кобрынскі веснік», «Народная трыбуна», «Заря», «Літаратура і мастацтва» і інш. З 2012 года актыўна займаецца мастацкай фатаграфіяй. У 2024 годзе, напярэдадні 60-гадовага юбілею, Ігар Сідарук напісаў нізку новых аповедаў, частка з якіх друкавалася ў часопісе «Дзеяслоў», кнігі вершаў «Ваўкалак» і «Трохрадкоўі».



**СІНКЕВІЧ (Хвасцюк) Ніна Рыгораўна** – выдатнік асветы СССР, інспектар школ Міністэрства асветы СССР, супрацоўнік цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў.

Аўтар шматлікіх вершаў, прысвечаных педагогам.

Выпускніца 1953 года сярэдняй школы № 1 г. Кобрына.



**СТРОК Яўгеній Якаўлевіч** (1947-2021) - кандыдат тэхнічных навук, дацэнт. Нарадзіўся 30 чэрвеня 1947 года. Закончыў з залатым медалём СШ № 1 г. Кобрына. Шлях у навуку Яўгенія Строка пачаўся ў 1965 годзе, калі ён стаў студэнтам Беларускага політэхнічнага інстытута. Атрымаўшы ў 1970 годзе дыплом інжынера-механіка па спецыяльнасці «Тэхналогія машына-будавання», Яўгеній Строк звязаў сваё жыццё з навукай і тэхнікай. У 1980 годзе Яўгеній Якаўлевіч абараніў кандыдацкую дысертацыю. Атрымаўшы навуковую ступень, усур'ёз заняўся распрацоўкай праекта па ўкараненні ў беларускую прамысловасць аўтаэлектронікі і гідраўлікі айчыннай вытворчасці. Працаваў загадчыкам лабараторыі электра-гідраўлічных сістэм кіравання Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Беларусі.

**ЯГЕЛЛА Уладзіслаў** – курсант і афіцэр Арміі Краёвай. Выпускнік кобрынскай гімназіі. У званні курсанта ваеннага вучылішча ўдзельнічаў у барацьбе з нямецкімі акупантамі ў верасні 1939 года. У 1941 годзе ўступіў у рады Арміі Краёвай у званні сяржанта, камандаваў узводам, быў двойчы паранены. У сакавіку 1945 года добраахвотна ўступіў у народнае польскае войска. Пасля вайны быў старшынёй аэраклубаў Рэспублікі Польшча, намеснікам старшыні Міжнароднай авіяцыйнай федэрацыі, начальнікам штаба інспекцыі авіяцыі Польшчы. За ўдзел у барацьбе з нямецкімі захопнікамі, а таксама за заслугі ў развіцці ўзброеных сіл краіны ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Сцяга II ступені, крыжамі камандорскімі і кавалерскім ордэнам адраджэння Польшчы, Крыжам Мужнасці, медалём «За перамогу і свабоду», а таксама савецкім ордэнам Чырвонага Сцяга і медалём «За перамогу над Германіяй».

# Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» свята шануе традыцыі школы, імкнецца аб'яднаць духоўную культуру мінулых стагоддзяў і сучаснасць.




**115-гадовы шлях школы – адлюстраванне гісторыі нашага горада. За гады існавання навучальнай установы неаднаразова змяняўся яе статус, аднак ніколі не змянялася яе асноўнае прызначэнне – выхоўваць, вучыць, даваць пуцёўку ў жыццё сваім выпускнікам.**

# СПІС КРЫНІЦ

**Самая «першая»** : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – 44 с. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**УА «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына»** – 115 гадоў // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 193.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі**.** Заслужаныя настаўнікі. Кірылаў Міхаіл Ільіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 438. – (Імі ганарацца землякі).

[**Навукоўцы** – выпускнікі СШ № 1 г. Кобрына] // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2020.

**Помнікі** архітэктуры, горадабудаўніцтва. **Будынак СШ № 1** // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 30-31.

**Ігар Сідарук**: «Іншым разам радок дыктуе само неба…» : біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук. – Кобрын, 2024. – 40 с. : фат.

Біябібліяграфічны паказальнік прысвячаецца жыццю і творчасці кобрынскага пісьменніка, паэта, драматурга, фатографа, выпускніка СШ № 1 г. Кобрына Ігара Сідарука.

**Краязнавец з вялікай літары** : біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2019. - 56 с. : іл. – (Серыя «Асоба ў гісторыі малой радзімы»).

Біябібліяграфічны паказальнік прысвечаны краязнаўцу, гісторыку, выдатнаму кіраўніку, публіцысту, ганароваму грамадзяніну горада Кобрына, выпускніку СШ № 1 г. Кобрына Аляксею Міхайлавічу Мартынаву.

**Бакун, Е.** От маленьких идей к большим проектам / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 27 студзеня (№ 4). — С. 1, 14 : фот.

Учащиеся 11 класса ГУО "Средняя школа № 1 г. Кобрина" А. Гольцман и М. Ариванович с победой вернулись с областного этапа республиканского молодежного проекта "Сто идей для Беларуси".

**Елизарова, Ж.** В международном форуме "Дети Содружества" принял участие кобринчанин / Жанна Елизарова ; фото из архива Арсения Бойко // Кобрынскі веснік. - 2024. — 10 жніўня (№ 32). — С. 15 : фот.

Учащийся 11 класса ГУО "Средняя школа № 1 г. Кобрина" Арсений Бойко принял участие в международном форуме "Дети Содружества".

**Бакун, Е.** Учитель — звучит гордо / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 26 жніўня (№ 56). — С. 7 : фот.

О ветеране педагогического труда СШ № 1 г. Кобрина Раисе Мокроус.

**Бакун, Е.** Есть у школы свой возраст и голос… / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2020. – 2 снежня. – С. 1,4 : фот.

Старейшая в городе средняя школа № 1 в этом году отмечает 110-ю годовщину.

**Елізарава, Ж.** Выхаваць чалавека, патрыёта, грамадзяніна / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. – 2020. – 3 кастрычніка. – С. 1, 2.

Аб настаўніцы гісторыі і грамадазнаўства сярэдняй школы № 1 г. Кобрына Н. В. Рагачук.

**Елизарова, Ж.** Есть у школы свой возраст и голос... / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун и из архива школы // Кобрынскі веснік. - 2020. - 2 снежня (№ 93). - С. 1, 4 : фот.

**Курачук, С.** Школьный юбилей как целая эпоха / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2020. – 26 ноября (№ 48). – С. 4.

**Пальто, К.** Новая книга для шахматистов / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2019. - 20 лютага. - С. 8.

Отличник образования Беларуси, мастер ФИДЕ, выпускник СШ № 1 С. И. Давыдюк презентовал 28-ю книгу по шахматам.

**Рогачук, Н. В.** Прогулка с историческими персонажами… / Н. В. Рогачук, Н. И. Шустицкая // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2019. - № 4. – С. 64.

**Михута, И. Ю**. Зажечь искру потребности к знаниям / Игорь Михута ; [беседовала] Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. - 14 июня. - С. 3.

Беседа с уроженцем г. Кобрина, кандидатом педагогических наук, доцентом И. Ю. Михутой, выпускником СШ № 1 г. Кобрина.

**Мокроус, Р. Н**. Будущее начинается сегодня / Р. Н. Мокроус // Кобрин информ. – 2018. – 31 мая (№ 22). – С. 4.

Средняя общеобразовательная школа № 1 г. Кобрина - старейшее в городе учреждение образования.

**Пальто, К.** История в образах / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2018. - 5 мая. - С. 8.

В СШ № 1 г. Кобрина работает клуб по интересам «Импульс».

**Кузина, С.** Становление советского школьного образования на Кобринщине / Светлана Кузина // Кобрин-информ. - 2017. - 28 декабря. - С. 6.

**Елизарова, Ж.** Охотник за насекомыми / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2017. – 11 лістапада. – С. 3.

О белорусском энтомологе, ст. научном сотруднике национального Березинского биосферного заповедника кобринчанине, выпускнике СШ № 1 А. Лукашуке.

**Ліхван, Г.** Захавальнік гісторыі — школьны музей / Ганна Ліхван // Кобрынскі веснік. - 2017. - 15 сакавіка. - С. 5.

Музей УА «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» захоўвае інфармацыю пра дзейнасць школы ў розныя перыяды нашай гісторыі.

**Бялоў, Д.** Энтузіяст, спартсмен, настаўнік / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2016. - 21 мая. - С. 1, 2.

Напярэдадні Дня работнікаў фізічнай культуры і спорту аб А. Калтунчыку, настаўніку фізічнай культуры СШ № 1 г. Кобрына.

**Дзятко, Д.** Пра майго настаўніка / Дзмітрый Дзятко // Роднае слова. - 2015. - № 10. - С. 48-49.

Да 65-годдзя Паўла Міхайлава, выпускніка СШ № 1 г. Кобрына, беларускага мовазнаўца, педагога.

**Грышкевіч, С.** Рэзервы ёсць, арыенцір - якасць / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2013.- 31 жніўня. - С. 4.

На абласной жнівеньскай нарадзе педагагічных работнікаў Брэстчыны адзначаны ў ліку іншых якасная кіраўніцтва СШ № 1, № 3 г. Кобрына.

**Кандрашук, Н.** За одну ночь на 450 лет назад / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2013. – 30 мая. – С. 6.

Учащиеся СШ № 1 г. Кобрина приняли участие в акции «Музейная ночь».

**Мельнік, Р.** Не страчваюць сувязі са школай / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік . - 2013. - 2 сакавіка. - С. 2.

Адміністрацыя і педагагічны калектыў СШ № 1 удастоены дыпломам другой ступені ў абласным конкурсе-аглядзе на лепшую ўстанову адукацыі па рабоце з ветэранамі.

**Литошенко, М.** «Его невозможно забыть …» / Маргарита Литошенко // Кобрин-информ. – 2012. – 18 октября. – С. 29.

В ноябре исполнилось бы 100 лет М. И. Кириллову, который с 1945 года был учителем, а затем завучем СШ № 1 г. Кобрина.

**Елизарова, Ж.** Легким нажатием джойстика / Жанна Елизарова // Кобрин- информ. – 2011. – 13 января – С. 30.

В далёком 1965 г. начался путь в науку кобринчанина, выпускника СШ № 1 Е. А. Строка.

**Степанян, Н. Н**. Памяти Степана Ильича Гопасюка / Н. Н. Степанян // Известия Крымской астрофизической обсерватории. – 2011.– Т. 107, № 1. - С. 219 - 223.

**Хурсін, А.** «Школа майго жыцця» / Аляксандр Хурсін // Кобрынскі веснік. - 2011. - 16 ліпеня. - С. 10.

**Белов, Д.** Школа № 1: история, судьбы, перспективы / Дмитрий Белов, Раиса Мокроус // Кобрынскі веснік. - 2010. - 30 кастрычніка. - С. 4.

СШ № 1 г. Кобрина отметила своё столетие.

**Бялоў, Д.** У паход – за ведамі / Дзмітрый Бялоў, Аляксей Максімчык // Кобрынскі веснік. – 2010. – 4 верасня. – С. 1.

Школьная лінейка ў СШ № 1.

**Веремеенко, С**. Учитель не звание, учитель - призвание / Светлана Веремеенко // Кобрин-информ. - 2010. - 30 сентября. – С. 6.

Об учителе белорусского языка и литературы СШ № 1 В. В. Ионовой.

**Волков, С.** С юбилеем, школа! / Сергей Волков // Заря. - 2010. - 4 ноября. - С. 4.

Кобринская СШ № 1 отметила столетний юбилей.

**Дзятко, Д.** Адданы беларускай навуцы / Дзмітрый Дзятко // Роднае слова. – 2010. – № 10. – С. 33-35.

Да 60-годдзя П. А. Міхайлава, выпускника СШ № 1 г. Кобрина, беларускага мовазнаўца, педагога, спецыяліста ў галіне дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, анамастыкі, этналінгвістыкі, навуковай тэрміналогіі.

**Савчук, М.** Для нас всегда открыта в школе дверь... / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2010. - 4 ноября (№ 44). - С. 1,2.

СШ № 1 – 100 лет.

**Сарычев, В.** Школа моей мамы / Василий Сарычев // Вечерний Брест. - 2010. - 10 ноября. - С. I, II. - (Вечерочка).

Кобринская СШ № 1 отпраздновала столетие.

**Школе № 1** - 100 лет // Кобрынскі веснік. - 2010. – 7 жніўня. - С. 2.

**Школе № 1** - 100 лет // Кобрин-информ. - 2010. – 5 августа. - С. 23.

**Бялоў, Д**. Да навучальнага года - гатовыя: хутка – 1 верасня / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. – 26 жніўня. - С. 1.

**Бялоў, Д.** Насустрач жыццю / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. - 3 чэрвеня. - С. 1.

Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына.

**Васюк, Н.** Язык талантливых мастеров / Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2009. - 1 октября. - С. 2.

Валентина Васильевна Ионова – учитель белорусского языка и литературы СШ № 1.

**Его** именем названа планета // Кобрин-информ. – 2009. – 17 сентября. – С. 27.

С. И. Гопасюк, выпускник СШ № 1 г. Кобрина, доктор физико-математических наук, астрофизик, заслуженный деятель науки и техники Украины.

**Талантливые** люди талантливы во всем // Кобрин-информ. – 2009. – 17 сентября. – С. 27.

Уроженец Кобринщины, выпускник СШ № 1 Георгий Омельянюк - кандидат биологических наук, доктор юридических наук Российского федерального центра судебной экспертизы при Минюсте России.

**Акцыя «**Чысты бераг» // Народная трыбуна. - 2008. - 10 мая. - С. 3.

Навучэнцы СШ № 1 прынялі ўдзел у патрыятычнай акцыі **«**Чысты бераг».

**Мельнік, Р.** Спартзала - прыемны сюрпрыз / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2008. - 11 кастрычніка. - С. 3.

У СШ № 1 адчыніліся дзверы новай сучаснай спартыўнай залы.

**Новый** спортзал в СШ № 1 // Кобрин-информ. - 2008. - 18 сентября. - С. 2.

**Олейник, Е**. Самая «первая» / Евгений Олейник // Кобрынскі веснік. - 2008. - 9 ліпеня. - С. 6.

**Готовь** школу летом // Вечерний Брест. - 2007. – 29 июня. - С. 1.

В Кобрине ведётся капитальный ремонт городских школ № 1, № 2 г. Кобрина.

**Максимчик, А.** Особый заказ: Мы и наши дети / Алексей Максимчик // Кобрынскі веснік. - 2007. – 1 жніўня. - С. 3.

О ходе ремонта СШ № 1.

**Патоня, В.** Настаўнік, які любіць падарожжы / Вікторыя Патоня // Кобрынскі веснік. - 2007. – 10 кастрычніка. - С. 4.

Пра настаўніка фізкультуры СШ № 1 Кобрына Аляксандра Парфенюка.

**Пянко, А.** У школы будет спортзал : Строим! / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2007. - 15 снежня. – С. 2.

Строится спортивный зал СШ № 1.

**Савчук, М.** 50 лет спустя / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2007. – 21 сентября. – С. 2.

Встреча выпускников 1956 года в СШ № 1.

**Шевченко, А.** Учитель как подарок судьбы / Алла Шевченко // Кобрин-информ. - 2007. - 24 мая. - С. 2.

Об учителе начальных классов СШ № 1 г. Кобрина, ветеране труда Н. А. Новицкой.

**Шепетюк, Н.** Первый раз в новый класс / Наталья Шепетюк // Кобрин - информ. - 2007. - 16 августа. – С. 2.

За три летних месяца школы № 1, 2, 3 должны измениться до неузнаваемости.

**Пятроўская, М.** Гучалі ў школе песні вайны / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2005. – 16 лютага. – С. 2.

У СШ № 1 адбылася сустрэча з ваеннай песняй.

**Пятроўская, М.** Летапіс кабрынчан – лепшы ў рэспубліцы / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2004. – 4 снежня.

Вучні СШ № 1 г. Кобрына атрымалі Дыплом І ступені ў вобласці, занялі І месца ў рэспубліцы за лепшы летапіс да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Час** пазнанняў і адкрыццяў // Кобрынскі веснік. – 2003. – 26 красавіка. С. 2.

Гісторыя школы і Кобрыншчыны ў кнізе «Памяць. Кобрынскі раён» – такая сустрэча адбылася ў СШ № 1.

**Піліпук, С.** Цікавыя людзі побач / Света Піліпук // Маладзік. - 2001. - № 1. - С. 1, 3.

Боўбель Яўген Іванавіч - кандыдат фізіка-матэматычных навук, ураджэнец г. Кобрына, выпускнік сярэдняй школы № 1.

**Мартынов, А. М.** Биография юбиляра / А. М. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1995. – 9 снежня. - С. 2.

Из истории школьного дела г. Кобрина, упоминается СШ № 1.

**Ляшук, В.** Місіянерка з Грушава / В. Ляшук // Народная трыбуна. – 1995. – 5 жніўня.

Аб ролі Марыі Радзевіч у літаратурным і палітычным жыцці Палесся.

**Акімава, В.** Яе прызванне / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1973. – 8 сакавіка.

Аб настаўніцы СШ № 1 г. Кобрына М. А. Астратавай.

**Куксёнак, Р**. І атэстат, і правы шафёра / Р. Куксёнак // Настаўніцкая газета. – 1971. – 5 чэрвеня.

З экзаменаў у школе № 1 Кобрына.

# СПІС
## перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік

Вечерний Брест

Гісторыя і грамадазнаўства

Заря

Известия Крымской астрофизической обсерватории

Камуністычная праца

Кобрин-информ

Кобрынскі веснік

Маладзік

Народная трыбуна

Настаўніцкая газета

Роднае слова

Советская Белоруссия

# ЗМЕСТ

| | | |
|---|---|---|
| | **Ад складальніка** | 3 |
| **I.** | Гартаючы старонкі школьнага летапісу | 5 |
| **II.** | Сучасны дзень школы | 12 |
| **III.** | Захавальнік гісторыі — школьны музей | 17 |
| **IV.** | Знакамітыя выпускнікі школы | 20 |
| | **Спіс крыніц** | 37 |
| | **Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік** | 46 |

# САМАЯ ПЕРШАЯ

**Да 115-годдзя з часу заснавання**
**дзяржаўнай установы адукацыі**
**«Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына»**

***Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне***
***з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне»***


Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп'ютарная падрыхтоўка выдання: С. Д. Курачук
Мастацкае афармленне вокладкі: П. С. Грыневіч

На беларускай, рускай мовах

Надрукавана на камп'ютарна-выдавецкай тэхніцы
Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы



Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, г. Кобрын
Раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
E-mail kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by